## ПЁТРА СЕРГІЕВІЧ – БЕЛАРУСКІ МАСТАК З ЛІТВЫ

***Васільеў П.А.***

*малодшы навуковы супрацоўнік УК “Музей гісторыі і культуры г. Наваполацка”, г. Наваполацк, Рэспубліка Беларусь*

На сённяшні час шмат імёнаў выдатных беларускіх мастакоў-эмігрантаў забыта на радзіме, або толькі нязначна згадваецца. Адно з іх – Пётра Сергіевіч, беларускі мастак-эмігрант, актыўны дзеяч беларускага адраджэння ў 30-я гады, да таго ж яшчэ з’яўляецца Залужаным дзеячам мастацтв Літвы (1965 год). Ён з’яўляўся мастаком універсальнага таленту і працаваў амаль у ва ўсіх жанрах: сюжэтна тэматычныя карціны і жанравыя сцэны, гістарычныя палотны, партрэты сучаснікаў і краявіды.

Беларускія эмігранты ўнеслі велізарны ўклад у развіццё ня толькі тых краін у якіх яны пражывалі, але і садзейнічалі развіццю міжнародных адносін з Беларуссю, тым самы ўмацоўвая яе аўтарытэт у свеце. Іх дзейнасць патрабуе ў сённяшні час дасканалага вывучэння.

Цэль – аналіз біяграфічных звестак Пётры Сергіевіча і асабістага ўклада ў развіццё культуры Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне будуецца на аналізе корпуса мастацтвазнаўчых і культуралагічных тэкстаў, якія тычацца розных аспектаў дзейнасці беларускай дыяспары на сусветнай арэне. У працы выкарыстоўваюцца параўнальна-супастаўляльны і аналітычны метады даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Менавіта творчая кар’ера Пётры Сергіевіча, якая склалася на працягу амль 65 год творчай дзейнасці, уключыла ў сябе сапраўдную галерэю сацыяльных тыпаў і характараў беларусаў 20 стагоддзя. Жыццё гэтага славутага мастака пачалося ў 1900 годзе ў вёсцы Стаўрова Дзісенкага павета Віленскай губерні ( сучасная Браслашчына), у вельмі беднай сямьі. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі хлопец апынуўся ў тагасным Петраградзе, дзе ўладкоўваецца у майстэрню па вырабе вогнетушыцеляў, а потым у нейкую экспедыцыю па падрыхтоўцы дзяржаўных папер. Праз год Сергіевіч трапіў на фабрычныя курсы, дзе улюблёным для яго стала маляванне ў якім ён паказаў добрыя здольнасці ў малюнку[ 1].

Праз нейкі час будучы мастак пераязджае да старэйшага брата ў Вільню, дез вечарамі наведвае курсы ў прыватнай Вольнай мастацкай студыі Адам Варнаса, пазней становіцца вольным слухачом мастацкага факультэта Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя ў знакамітага дэкана – прафесра Фердынанда Рушчыца., які і аказаў найбольшы ўплыў на станаўленне творчай асобы. На трэцім годзе навучанне разам з сябрамі пераязджае ў Кракаў дзеля папаўнення ведаў ў Акадэміі мастацтваў, але затрымліваецца там Пётра Сергіевіч толькі на год пасля чаго вяртаецца ў Вільню. А з 1926 па 1928 гады вучыцца ў майстэрні прафесара Людаміра Сляндзінскага. У 1932 годзе мастак атрымоўвае віленскую прапіску і адразу ж уступае ў “Віленскае таварыства незалежных мастакоў” [2].

Першую сваю персанальную выставу мастак зрабіў у канцы 1935 года. Менавіты пра гэту выставу на жаль невядомы рэцензент у часопісе “Шлях моладзі” напісаў: “Пётра Сергіевіч ёсць жывапісец цалкам беларускі. Любым яго матывам ёсць праца селяніна на полі, вясковыя флірты, народныя гульні – словам усё сялянскае жыццё. Нямала мастак прысвячае і нашай мінуўшчыне. Тут мы бачым сцэну паўстанцаў 1863 года на чале з Каліноўскім і другую карціну – “Выправа на вайну ваяроў пад кіраўніцтвам князя Усяслава”. У 1930-я гады Сергіевіч піша гістарычныя палотны, прысвечаныя Францішку Скарыну, партрэты выдатных беларусаў: Максіма Танка, Міхася Машары, Міхася Забейда-Суміцкага, Францішка Багушэвіча, ксяндза Станіслава Глякоўскага, студэнтаў, рабочых, інтэлігенцыі і інш. Таксама Пётра Сергіевіч з’яўляўся выдатным мастаком – манументалістам, які распісваў касцёлы ў Смаргоні, Шарашове, Солах і Гродне. Падчас Другой сусвеьнай вайны мастак перабіраецца ў Беларусь, дзе жыве ў роднай вёсцы і малюе за ежу. У 1943 гаду мастак зноў апынуўся ў Вільні, дзе з 1944 па 1945 уладкоўваецца ў Беларускі гісторыка-этнаграфічны музей, які змяшчаўся ў сценах віленскага Базыліянскага манастыра.Менавіта Сергіевіч, як галоўны спецыяліст музея, спрыяў фарімраванню музейных калекцый сённяшней Беларусі. Ён быў адказны за падрыхтоўку да адпраўцы экспанатаў у Мінск. Срод іх былі унікальныя гістарычныябеларускія рэліквіі, рэчы народнага побыту, творы фальклорнага мастацтва, старажытны жывапіс, разьба, вялікая бібліятэка аб ВКЛ, старадаўнія выданні, у тым ліку і кнігі Скарыны, графічныя замалёўкі і эцюды Я. draздовіча ды іншых мастакоў і г.д. [2].



Репозиторий ВГУ

У 1950 – 1960-я гады мастак ужо піша ня толькі пагрудныя партрэты, але звяртаецца да тэмы пейзажу. З-пад яго пэндзля выходзяць наступныя фігуратыўныя кампазіцы, як “Кастусь Каліноўскі і Валерый Урублеўскі на аглядзе паўстанцаў”, “Арышт Паўлюка Багрыма” і “Францішак Скарына ў рабочым кабінеце”. У 1978 гаду адбываецца яго персанальная выстава ў Мінску. Памёр мастак у лістападзе 1984 года ў Вільні і пахаваны на віленскіх вайсковых могілках. У лютым 2003 г. у Беластоку была арганізаваная рэтраспектыўная выстава Пётры Сергіевіча. Мэтай выставы была прэзентацыя творчасці мастака, якая захавалася ў Польшчы (усе “польскія” карціны Сергіевіча знаходзяцца ў прыватных зборах). Выстава ўражвала сваёй разнастайнасцю і колькасцю прац. Паказаны, перадусім, пейзаж і партрэт, агулам – 40 карцін. Сёння вядомыя 116 "польскіх" твораў (згадваюцца ў альбоме, выдадзеным з нагоды выставы). Арганізатарамі выступілі Беларускае таварыства “Хатка” ў Гданьску, Кафедра Беларускай культуры ў Беластоку, “Muzeum Alfonsa Karnego” ў Беластоку, Гістарычны музей горада Гданьска, Беларускае гістарычнае таварыства [3].

**Заключэнне**. У гісторыі беларускага жывапісу творчасць П. Сергіевіча займае значнае месца. Спадчына мастака – больш за 600 палотнаў на гістарычную тэматыку, пейзажы, партрэты выдатных сыноў Беларусі. Менавіта пра яго даследчык культуры Уладзімір Глыбінны ў артыкуле, напісаным да шасцідзесяцігоддзя мастака, сказаў: “Мастак народнага жыцця.”


1. Гваздзёў, С. Крэскі да партрэтаў мастакоў з Заходняй Беларусі / С. Гваздёў. – Мінск: Галіяфы. – 2013. – 127 с.
2. Крэпак Б.А. Вяртанне іменаў. Нарысы пра мастакоў. Кніга 2 / Б.А. Крэпак. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – 256 с.
3. Сергіевіч, П. Аўтабіяграфія / П. Сергіевіч // Мастацтва. – 1993. – №1. – С. 62 – 67.


## ОСОБЕННОСТИ ВИЗУАЛИЗАЦИИ МУЗЫКАЛЬНЫХ ОБРАЗОВ В ГРАФИЧЕСКОМ ДИЗАЙНЕ


***Гонжуров Г.А.***

*магистрант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

*Научный руководитель – Цыбульский М.Л., канд. искусствоведения, доцент*


Визуализация – общее название приёмов представления числовой информации или физического явления в виде, удобном для зрительного наблюдения и анализа.

Музыкальный образ – это вместе взятые характер, музыкально-выразительные средства, общественно-исторические условия создания, особенности построения, стиль композитора.

Визуализация музыкальных образов в графическом дизайне – создание художественного материального продукта в виде обложки произведения (альбома, EP, сингла, сборника и т.д.) на основе входящих туда музыкальных композиций, объединённых общей концепцией, идеей, смыслом.

Появление такого феномена, как обложка музыкального альбома, во многом является свидетельством уникального симбиоза таких направлений в искусстве, как графический дизайн и музыка. Уходя корнями в конец XIX века, во времена восковых цилиндров, затем грампластинок, лонгплеев, аудиокассет, CD-дисков и заканчивая нашими днями, когда музыка почти исчезла с физических носителей и перешла в цифровую среду. Эти качественные изменения не только информируют, но и являются одновременно серьезным средством формирования вкусов, предпочтений.

Комплексное по форме и интегрированное по содержанию оформление обложки альбома для какого-либо коллектива невозможно создать без включения в этот процесс элементов дизайнерской деятельности, основанной на художественной ценности и единстве функциональной целесообразности [3, с.110].

В процессе создания изображения на основе музыки дизайн выступает, как связующее звено для привлечения потенциального слушателя.

Цель работы – анализ особенностей процесса визуализации музыкальных образов с помощью графического дизайна в 1970-2010-е гг.

**Материал и методы.** Материалом является исследование графического дизайна музыкальной продукции (CD-обложка сингла, альбома, сборника, EP; сопутствующие буклеты; конверты виниловых и грампластинок; обложки и буклеты в цифровой среде).

Репозиторий ВГУ